***Жыганава А.П. (Мінск)***

# МІФАЛАГЕМА ВЕЧНАЙ ЖАНОЦКАСЦІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

Міфалагема Вечнай Жаноцкасці, як і кожны ўніверсальны вобраз, уяўляе сабой тэкст, які валодае адзіным значэннем, што дазваляе вылучыць яго з навакольнага семіятычнага кантэксту. “Падобны тэкст ніколі не належыць якому-небудзь аднаму сінхроннаму зрэзу культуры: ён заўсёды пранізвае гэты зрэз па вертыкалі, прыходзячы з мінулага і сыходзячы ў будучыню” [3, с. 65]. Менавіта такім тэкстам і з’яўляецца міфалагема Вечнай Жаноцкасці. Пад тэрмінам міфалагема маецца на ўвазе “структурная адзінка рытуальна-міфалагічнага дыскурсу, якая ўяўляе сабой пэўны элемент цэласнай карціны свету, выражаны ў форме інварыянтнай сімвалічнай канструкцыі” [2, с. 6].

У кожным культурна-гістарычным кантэксце семантыка міфалагемы падвяргаецца зменам, дапаўняецца, аднак розныя іпастасі дадзенай міфалагемы (Алена, Сафія, Эноя, Дзева Марыя, Душа Свету) захоўваюць у сабе рысы першаўзору. Усе канкрэтныя вобразы міфалагемы Вечнай Жаноцкасці ў сусветнай культуры – гэта ні што іншае, як розныя спосабы ўвасаблення яе інварыянтнай сутнасці.

Жаночы персанаж з’яўляецца адной з рэпрэзентацый медытатыўнай сутнасці міфалагемы, што ў якасці структурных кампанентаў ўключае ролі-функцыі, сярод якіх можна вылучыць наступныя: дачка, нявеста, жонка, маці, блудніца. Ім уласцівы андрагіннасць, лакалізацыя ў маргінальным хранотопе, здольнасць правакаваць героя да здзяйснення ўчынкаў, якія крута мяняюць яго лёс. Гэтыя рысы ўвасабляюцца ў такіх вобразах дахрысціянскай культуры, як Афіна, Дземетра, Артэміда, Ліліт, Баба Яга, Васіліса Прамудрая і г.д.

Гэтыя ж уласцівасці захоўваюцца і ў жаночых вобразах, створаных у хрысціянскую эпоху, аднак яны падзяляюцца на станоўчыя (Беззаганная Жонка, Прыгожая Дама, Хрыстос) і адмоўныя (блудніца, спакусніца). Мужчынская прырода станоўчых вобразаў абумоўлівае немагчымасць фізічнага валодання імі героем, пажадлівасць якога рэалізуецца ў платанічнай любові і рыцарскім служэнні Прыгожай Даме. А спалучэнне ў адным вобразе супярэчлівых рыс мысліцца як недасканаласць і надае яму трагічную афарбоўку (такімі з’яўляюцца вобразы Наташы Растовай, Кацюшы Маславай, Сонечкі Мармеладавай, Грушанькі і г.д.).

Сваё адлюстраванне міфалагема Вечнай Жаноцкасці знайшла і ў беларускай літаратуры. У прыватнасці, у сярэднявечны перыяд асноўным спосабам ўвасаблення міфалагемы з’яўляўся вобраз Дзевы Марыі (Маці Божай), што было абумоўлена ўплывам хрысціянства на культуру беларусаў. Варта адзначыць і тую асаблівую пасрэдніцкую ролю, якую мела Дзева Марыя ў каталіцтве. Так, напрыклад, Філафей Утчыцкі ў “Стихах

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

краесогласных”, прысвечаных пераносу вобразу Багародзіцы ў Полацк, звяртаўся менавіта да Дзевы Марыі:

*Радуйся, Дево, радуйся спеваем,*
*Где чюдотворный твой образ стретаем.*
*Радуйся, Богу избранная мати,*
*Как приносящая много благодати* [4, т. 1, с. 81].

Асаблівае месца ў беларускай культуры належыць такому гістарычнаму персанажу, як Еўфрасіння Полацкая, якая сваімі ўчынкамі набыла святасць і стала рэальным увасабленнем Вечнай Жаноцкасці на гэтым свеце, пра што засведчыў у сваёй “Пахвале Ефрасіні Полацкай” Кірыла Тураўскі:

*Еуфросиниа – неуведающий цвет райскаго сада!*
*Еуфросиниа – небопарный орел,*
*попаривши от Запада и до Востока, яко луна солнечная,*
*просветивши всю землю Полоцкую!* [4, т. 1, с. 35]

Як можна заўважыць, у гэты перыяд у беларускай літаратуры ў большай ступені ўвасаблялася ідэальная іпастась міфалагемы Вечнай Жаноцкасці, так  званая тэалагема (“адзін з варыянтаў міфалагемы, яе ідэальная іпастась, якая ўзнікла і развівалася ў рамках хрысціянскай культуры” [2, с. 7] ), узыходзячая да архетыпу Сафіі Прамудрасці Божай.

Аднак з развіццём свецкай літаратуры жаночыя вобразы пачынаюць ўскладняцца і рэалізоўваць іншыя патэнцыі дадзенай міфалагемы. Напрыклад, Ян Баршчэўскі ў вершы “Дзеванька” піша:

*Прывучыла ж ты двух хлопцаў, як пташак у сеці.*
*Яны к табе і ўдзень і ўночы рады прыляцеці.*
*І ты к ім лятаеш,*
*Панскі двор пабуджаеш*
*На вялікі смех*... [4, т. 1, с. 150]

Асаблівае месца ў беларускай літаратуры займае вобраз Радзімы, які ў многіх паэтаў асацыюецца з вобразам маці і тым самым рэалізуе адну з асноўных роляў-функцый міфалагемы Вечнай Жаноцкасці. Пацвярджэнне таму знаходзім і ў вершах Янкі Купалы:

*Я тут бачу свой край, поле, рэчку і бор,*
*Сваю* ***матку-зямлю – Беларусь****...* [4, т. 1, с. 286];

і ў вершах Максіма Багдановіча:

*Маці родная,* ***Маці-Краіна****!*
*Не усцішыцца гэтакі боль…*
*Ты прабач, Ты прымі свйго сына,*
*За цябе яму ўмерці дазволь…* [4, т. 1, с. 440];

і ў вершах Пімена Панчанкі:

*Краіна мая, радасць мая,*
*Песня мая маладая!*
*Па нівах тваіх, па тваіх гаях*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

***Сынава** сэрца рыдае!* [4, т. 2, с. 510]

У пачатку XX стагоддзя ў беларускай літаратуры з’яўляецца вобраз Вечнай Жаноцкасці як сімвал выратавання свету, што знаходзіцца на мяжы катастрофы. Гэты матыў сугучны тым, якія зўзніклі ў гэты перыяд і ў рускай літаратуры (напрыклад, у творчасці Аляксандра Блока, Андрэя Белага і інш.). Паэты звяртаюцца да Яе з просьбай аб выратаванні і бачаць ў Ёй Бога (ці Багіню). Так, у Янкі Купалы знаходзім:

*Так ўславіў яе ў славу сонца і зор,*
*Так маліўся дзень-ноч к ёй мальбою нябёсаў…* [1, т. 1, с. 238]

Падобныя да гэтых матывы можна назіраць і ў вершах Цішкі Гартнага:

*Цвітуча, як ружа, пахуча, як бэз,*
*З’явілась яна да мяне*
*З чароўнага краю, з-пад высі набес,*
*У марах салодкіх у сне…* [1, т. 1, с. 497];

і ў вершах Максіма Багдановіча, у тым ліку і ў бесмяротным рамансе “Зорка венера”:

*Глянь іншы раз на яе, – у расстанні*
*Там з ёй зліем мы пагляды свае…*
*Каб хоць на міг уваскрэсла каханне.*
*Глянь іншы раз на яе* [4, т. 1, с. 426].

Абагульняючы вышэйсказанае, варта заўважыць, што ўсе жаночыя персанажы, рэалізацыі міфалагемы Вечнай Жаноцкасці, валодаюць шэрагам прыкмет, якія і дазваляюць трактаваць іх як іпастасі гэтай міфалагемы. Такімі прыкметамі з’яўляюцца: прыналежнасць да пэўных сегментаў хранатопу, каляровыя характарыстыкі, здольнасць трансфармавацца з вобраза ў вобраз, захоўваючы рысы першаўзору, здольнасць правакаваць мужчынскія персанажы да перамяшчэння за мяжу светаў, у рамках якіх яны знаходзяцца, тым самым рэалізуючы сваю асноўную функцыю – тварэння.

### *Літаратура*


1. Анталогія беларускай паэзіі: у 3 т.; рэдкал. Р. Барадулін і інш., уклад. А. Лойка. – Мінск : Маст. літ., 1993. – Т. 1–3.
2. Жиганова, Е.П. Особенности воплощения женского образа в творчестве А. Блока (ритуально-мифологический аспект)/ Е.П. Жиганова. – Монография; под ред. В.И. Самусенко. – Минск–Рига: “Лайма” – “Геликон” – “Золотой век”, 2008. – 96 с.
3. Лотман, Ю.М. Внутри мыслящих миров: Человек – текст – семиосфера – история / Ю.М. Лотман ; предисл. Вяч.Вс. Иванова. – М. : Прогресс, 1997. – 447 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ